


# ВІВАТ, “БУ-ШЫ-ДО”!

20.12.2016



Юбілейны дзень нараджэння адзначыў раённы клуб шатакан каратэ-до **“Бушыдо”.** Урачыстасці з нагоды 20-годдзя клуба прайшлі 16 снежня ў Палацы культуры. З 1996 года яго нязменным кіраўніком з’яўляецца ***Лілія Іванаўна Плахава.***

Разам з мужам ***Алегам Мікалаевічам*** яна выкладае каратэ дзецям і дарослым. За гады існавання клуба навучанне ў ім прайшлі звыш 400 чалавек. Сёння ў клубе займаюцца 45 чалавек ва ўзросце ад 6 да 57 гадоў.

Дзейнасць клуба не абмяжоўваецца трэніроўкамі. Патрыятычная работа, актыўны ўдзел у мерапрыемствах, спаборніцтвы, маладзёжныя праекты – вось чым жыве клуб.

Імёны асобных каратыстаў на слыху: ***Яўгеній Мухамеджанаў, Анастасія Рабава, Аляксандр Жук, Уладзіслаў Пяткевіч, Наталля Ватаманюк*** і іншыя. Актывісты клуба неаднаразова вярталіся з міжнародных ваенна-патрыятычных збораў, што праходзілі ў гарадах Расіі, з кубкам лепшага атрада збораў.

Больш падрабязна пра гэта чытайце ў суботнім нумары раённай газеты.